www.vg-gazeta.by

# Веснік Глыбоччыны

Газета раённага выканаўчага камітэта і раённага Савета дэпутатаў | серада, 15 ліпеня 2015 года № 56 (9504)

# I кружыць спелых вішань карагод...



## Уважаемые участники и гости районного праздника «ВИШНЁВЫЙ ФЕСТИВАЛЬ-2015»!

Сердечно приветствуем участников и гостей районного праздника «Вишнёвый фестиваль» в Глубоком!

Фестиваль — это возможность подняться над будничной суетой, стать немножко радостней и вдохновеннее.

Этот ожидаемый многими жителями и гостями Глубоччины фестиваль приобрел определенную известность не только в области, но и за рубежом. Уже в третий раз он собирает своих друзей на яркий со вкусом вишни праздник.

Убеждены, что «Вишнёвый фестиваль» внесет особый вклад в укрепление межнационального сотрудничества, свидетельством чему является участие в нем гостей из Прибалтики, России, Польши, Германии, Израиля, Грузии и других стран.

Надеемся, что участие в фестивале станет важным событием в жизни каждого из нас.

От всего сердца желаем всем участникам – здоровья, вдохновения, успехов, а гостям – незабываемых впечатлений и отличного настроения!

**О. В. МОРХАТ,**
**председатель Глубокского районного исполнительного комитета,**
**Г. В. УНУКОВИЧ ,**
**председатель Глубокского районного Совета депутатов.**

Вишнёвый фестиваль 2015

— ФЕСТЫВАЛЬНЫ ЛЕТАПІС —

# І зноў у нашым горадзе свята!

● Анатоль ЗІНКЕВІЧ.

**У трэці раз у Глыбокім праводзіцца «Вішнёвы фестываль». Плошчы, вуліцы і завулачкі, паркі і скверы нашага любімага гарадка напаўняюцца водарам спелых вішняў, музыкай, песнямі, гоманам радасным. З усяго навакольля, зблізку і здалёк, едуць у Глыбокае госці, едуць не толькі вішнямі ды прысмакамі рознымі з гэтай ягады паласавацца, а і падзівіцца, на што людзі ў краі вішнёвым здатныя, якія яны прадпрымальныя, гаспадарлівыя ды ўмелыя. А як спяваюць, граюць ды танцуюць – не налюбавацца! Шмат цікавых адкрыццяў, навінак, сюрпрызаў падрыхтавалі арганізатары фестывалю. Скажам па сакрэце, сёлета падчас тэатралізаванага шэсця Вішнёвая каралева паедзе ў "залатой" карэце (не прапусціце!). Мільён радасных эмоцый падораць і конкурс баяністаў-аматараў, і традыцыйныя «Вішнёвае» вяселле і аўкцыён «Вішнёвы пірог».**

Усё ж як гэта цудоўна, што ў нас ёсць такі незвычайны, змястоўны, прадстаўнічы, такі арыгінальны, каларытны, спеўны і … смачны фестываль! А таму сёння яшчэ раз хочацца горача падзякаваць людзям, якія сталі ініцыятарамі правядзення такога маштабнага праекта, кіраўніцтву раёна, асабіста старшыні райвыканкама Алегу Морхату і старшыні раённага Савета дэпутатаў Галіне Уноковіч, работнікам сферы спорту і турызму, якія загарэліся такой ідэяй.

Наш фестываль, скажам так, мае свае гістарычныя карані і вельмі арганічна спалучаецца з традыцыямі мясцовага побыту. Глыбокае, як вядома, здаўна славілася садаводамі і садамі з абавязковым наборам пладова-ягадных дрэў: яблынь, вішань, груш і сліў. А пайшла шырокая слава ад знакамітага агранома-садавода Баляслава Лапыра. Было гэта, як кажуць у нас, за "польскім часам". Адусюль ехалі людзі да павятовага агранома, каб набыць саджанцы вішань. Баляслаў Нікадзімавіч, інтэлігентны, дабрэйшай душы чалавек, не шкадаваў, раздаваў саджанцы кожнаму жадаючаму. Так "лапыровы вішні" і разрасталіся па ўсіх сядзібах. І цяпер, куды не кінь – усюды садок ды вішэннік…

У 2012 годзе падчас работы 3-га Міжнароднага форума "Імідж Беларусі: час дзейнічаць" праводзіўся конкурс творчых работ па брэндзінгу рэгіёнаў краіны. Наш раён прадставіў на гэты конкурс праект "Вішнёвы фестываль у Глыбокім", які заняў другое месца. А са студзеня 2013 года і распачалася рэалізацыя ідэі. Была распрацавана канцэпцыя творчага праекта. Праводзіўся конкурс на лепшую эмблему фестывалю, была напісана песня-гімн "Глыбокае – вішнёвы гарадок". І, нарэшце, пасля праведзенай вялікай падрыхтоўчай работы, з 24 па 26 ліпеня 2013 года адбыўся першы «Вішнёвы фестываль», у праграме якога было шмат цікавейшых мерапрыемстваў, сярод якіх інвестыцыйны форум, тэатралізаванае шэсце з Вішнёвай каралевай, гашэнне спецыяльнай тэматычнай паштовай маркі, урачыстая рэгістрацыя шлюбу – "Вішнёвае вяселле", аўкцыён "Вішнёвы пірог" і інш.

Год таму праходзіў другі «Вішнёвы фестываль». Па маштабах ён выглядаў больш сціпла, чым першы, але ўсе асноўныя, традыцыйныя мерапрыемствы ладзіліся на самым высокім узроўні. І вось мы зноўку ў віхуры фестывальных падзей, і радасны кідаем кліч: "Няхай плыве салодкі водар спелых вішань! Мы вельмі любім наш фестываль!"




## О приёме документов о выдвижении представителей в состав территориальных комиссий по выборам Президента Республики Беларусь

Документы по выдвижению представителей в состав Глубокской районной комиссии по выборам Президента Республики Беларусь принимаются в здании Глубокского районного исполнительного комитета (г. Глубокое, ул. Ленина, 42, кабинет № 59).

**Время приёма документов:**
с понедельника по пятницу
**с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00**
выходные дни: **18 июля 2015 года (суббота) и 19 июля 2015 года (воскресенье) с 8:00 до 13:00 и с 14:00 до 17:00.**

## Решение Глубокского районного исполнительного комитета № 678 от 13 июля 2015 г. «Об определении мест, запрещенных для проведения пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь»

В соответствии со статьями 24, 61 Избирательного кодекса Республики Беларусь Глубокский районный исполнительный комитет РЕШИЛ:

1. Запретить проведение пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь на расстоянии менее 50 метров от зданий Глубокского районного исполнительного комитета (далее – райисполком), суда Глубокского района, прокуратуры Глубокского района, отдела внутренних дел райисполкома, Глубокского районного отдела по чрезвычайным ситуациям, Глубокского отдела Департамента охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, Глубокского районного военного комиссариата, сельских исполнительных комитетов, учреждений образования, организаций здравоохранения, воинских частей, объектов водо-, тепло- и энергообеспечения.

2. Отделу внутренних дел райисполкома:

2.1. обеспечить охрану общественного порядка в местах проведения пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь;

2.2. принять меры по предотвращению проведения пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь в запрещенных для этих целей местах.

3. Отделу идеологической работы, культуры и по делам молодежи райисполкома разместить на официальном сайте райисполкома и опубликовать в газете «Веснік Глыбоччыны» информацию о местах, запрещенных для проведения пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь.

4. Контроль за выполнением настоящего решения возложить на заместителя председателя райисполкома по направлению деятельности, отдел внутренних дел райисполкома.

**О. В. МОРХАТ,**
**председатель райисполкома,**
**И. А. ПОЧЁПКО,**
**управляющий делами райисполкома.**

## Задача про вишню



Мякоть вишни окружает косточку слоем такой же толщины, как и сама косточка. Будем считать, что и вишня и косточка имеют форму шариков. Можете ли вы сообразить в уме, во сколько раз объем сочной части вишни больше объема косточки?

**Ответ:**

Из условия задачи следует, что диаметр вишни в 3 раза больше диаметра косточки. Значит, объем вишни больше объема косточки в 3*3*3=27 раз; на долю косточки приходится 1/27 объема вишни, а на долю сочной части - остальные 26/27. Следовательно, сочная часть вишни больше косточки по объему в 26 раз.

— РЭХА СВЯТОЧНАЙ ПАДЗЕІ —

# Слаўна пагасцілі

## «Вішнёвы фестываль» пабываў у гасцях «Славянскага базара ў Віцебску»

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ.
Фота Людмілы КАРНІЛОВІЧ, Таццяны МАЦЮШОНАК.

**"Вялікі дзякуй за радасць і добры настрой, атрыманыя ад наведвання вашага падвор'я. Усё афармлена арыгінальна і з густам. Вырабы, усялякая смаката вішнёвая выклікалі захапленне. Дзякуй за свята! Удачы і росквіту Глыбоччыне і вашаму "Вішнёваму фестывалю!".**

**"Усё так здарова! Жадаем "Вішнёваму фестывалю" доўгіх гадоў".**

**"Вялікі дзякуй арганізатарам падвор'я. З густам і любоўю аформлена кожная дэталь на падвор'і. Уражваюць усе экспанаты, створаныя ў нацыянальных традыцыях. Ветлівасць і добразычлівасць гаспадынь гэтага падвор'я прыцягваюць людзей. Выпечка, рукадзелле гавораць пра майстэрства людзей, якія жывуць у Глыбокім. Творчых вам поспехаў і росквіту вашаму краю".**

**"Самая яркая праграма фестывалю!!!".**

**"Шчыра дзякуем за гасціннасць, за стварэнне святочнага настрою, за цудоўныя ўсмешкі і добразычлівасць! З найлепшымі пажаданнямі росквіту і прадаўжэння беларускіх традыцый, мястачковыя жыхары г. Віцебска".**



…І яшчэ шмат падобных выказванняў са шчырай удзячнасцю і сардэчнымі пажаданнямі пакідалі госці фестывалю "Славянскі базар у Віцебску" ў Кнізе водгукаў "О вишне румяной замолвите слово" пасля агляду выставы. І амаль кожны наведвальнік глыбоцкага падвор'я абяцаў абавязкова прыехаць





у вішнёвую сталіцу на фестываль, каб зноў пабачыць і ўжо купіць разнастайную смакату, адмысловыя сувеніры і, несумненна, адчуць святочную атмасферу.

– "Вішнёвы фестываль" пабываў на "Славянцы" ў рамках свята-конкурсу тэатралізаваных прадстаўленняў гарадоў і раёнаў вобласці "Рознакаляровая Віцебшчына". Усе падвор'і размяшчаліся на плошчы Свабоды, кожны дзень змяняючы адзін аднаго. Наш дзень – 11 ліпеня. Побач з намі, напрыклад, "уладкаваўся" Лепельскі раён, – расказала галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Таццяна Мацюшонак. – Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, глыбоцкае падвор'е было самым яркім, вялікім, разнастайным і самым вішнёвым. Пра гэта нам гаварылі ўсе, хто заходзіў да нас на "агеньчык". А паказалі мы, сапраўды, на што здатныя нашы ўмельцы, вытворцы, гандляры. Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат прапаноўваў прадэгуставаць сваю вішнёвую "згушчонку", хлебазавод – духмяныя каравai з вішнямі, райспажыўтаварыства – усялякія кандытарскія вырабы з вішанькамі. Цукерачкі з вішанькамі і налівачку вішнёвую можна было паспрабаваць, прысеўшы ў зоне адпачынку, арганізаванай Глыбоцкім мясакамбінатам і РайСТ, пачытаць заадно рэкламную прадукцыю, брашуркі з рэцэптамі, сабранымі работнікамі раённай бібліятэкі. Больш поўную інфармацыю пра нашу Глыбоччыну госці віцебскага фестывалю атрымлівалі ля аформленага куточка аддзелам адукацыі,спорту і турызму райвыканкама. Стэнд "Глыбоцкі раён", буклеты з рэкламай "Вішнёвага фестывалю", мясцовых аграсядзіб заклікалі ўсіх цікаўных прыехаць да нас на непаўторны адпачынак.

Разбягаліся вочы і ад сувеніраў. Талерачкі, маечкі, шапачкі, ручкі, пакецікі і шмат што іншае з вішанькамі ці лагатыпам нашага фестывалю падрыхтавала Глыбоцкае райспажывутарыства. А колькі сувенірных цікавінак, зробленых сваімі рукамі, прадставілі Глыбоцкі дом рамёстваў, клуб народных майстроў «Крыніца», цэнтр дзяцей і моладзі, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Шчыравалі і работнікі культуры, якія вясёлымі песнямі сустракалі гасцей ля трона з Вішнёвай каралевай. Яна ж і са сцэны вітала, частавала вішнёвымі прысмакамі прысутных на плошчы Свабоды. У дапамогу ёй выйшлі – узорны ансамбль эстраднага танца "ВераНіка", узорны ансамбль барабаншчыц "Віват", салісты народнай эстраднай студыі "Архіў" Глыбоцкага гарадскога дома культуры.

Любавацца, захапляцца, фатаграфавацца цікаўныя падыходзілі да "цёмнага", хоць час працы глыбоцкай пляцоўкі быў абмежаваны з 9.00 да 20.00. Як усім хацелася ўсю смакату паспрабаваць, сувеніры набыць, а ім глыбачане адно гаварылі: "Прыязджайце ў Глыбокае на "Вішнёвы фестываль" і ўсё там будзе!" і шчодра частавалі вішнямі, каб смак адчулі і не маглі забыцца, каб ён у вішнёвую сталіцу і прывёў іх.

– Костачка ў глыбоцкай вішні рассмоктваецца, – звярталася да наведвальнікаў падвор'я, жартуючы, намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях Таццяна Леанідаўна Малатоўнік. – Толькі не тут, у Віцебску, а ў нас, у Глыбокім. Такая асаблівасць.

Што ж, паспрабуем глыбоцкай ягадкі ў вішнёвай сталіцы! Ёсць нагода – вішні паспелі, фестываль пачаўся!



# Карэта для каралевы

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ.
Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

**Думаю, што такі вясельны фотаздымак пажадае мець у сямейным альбоме кожная маладая пара Глыбоччыны. Сапраўды, жаніх і нявеста ў "залочанай" карэце глядзяцца па-каралеўску.**


Глыбачане Андрэй і Юлія Карандзей: першая сямейная фотасесія ў карэце.

Шыкоўны чатырохколавы сюрпрыз, запрэжаны парай коней, глыбачане і госці горада ўжо ацанілі 3 ліпеня падчас урачыстага шэсця на раённым свяце "Квітней, Глыбоччына!" (**на здымку**). А падчас "Вішнёвага фестывалю" яны ўбачаць, як у "залочанай" карэце праедзе па глыбоцкіх вуліцах Вішнёвая каралева – усе выгоды створаны адпаведна яе тытулу.

Думаю, нашым чытачам цікава ведаць: адкуль такое дзіва ў Глыбокім? Адказваем. Эксклюзіўная карэта "нарадзілася" ў глыбоцкай кузні "В ажуре" па заказе адкрытага акцыянернага таварыства "Глыбоцкі мясакамбінат".

– Наша прадпрыемства развівае і папулярызуе конны турызм. Мы прапануем разнастайныя паслугі: у нас можна заказаць конныя прагулкі ў лес, у поле вярхом, пакатацца на конях у выхадныя і святочныя дні, навучыцца верхавой яздзе, правесці з коньмі фотасесію... Каб пашырыць колькасць паслуг, з'явілася ідэя – зрабіць карэту, здаючы потым напракат на вяселлі, юбілеі і іншыя святы. Чарцяжы, раму, калёсы прадаставілі кузні " В ажуре", і там ужо пачаўся творчы працэс, – патлумачыў намеснік дырэктара ААТ "Глыбоцкі мясакамбінат" Сяргей Дзмітрыевіч Грыневіч.

Узімку пачалася скрупулёзная работа творцаў-кавалёў: дырэктара кузні Юрыя Татарыновіча і яго таленавітых памочнікаў Генадзя Галімскага і Віктара Савіцкага. Напачатку быў створаны эскіз, у якім да дробязяў былі прадуманы і карункавыя завіткі, і надзейнае мацаванне. Прыгажосць і якасць – галоўнае ў рабоце глыбоцкіх кавалёў, тым больш заказ яны атрымалі такі незвычайны. Таму і метал падабралі высокай якасці, і апрацавалі як след – на даўгавечнасць. Штосьці сімвалічнае ёсць у гэтым – маладыя, якія пракоцяцца на гэтай карэце, несумненна, стануць дружнай моцнай сям'ёй.

Усе дэталі, зробленыя кавалямі ўручную, надалі карэце непаўторнасць. Дарэчы, увесь паступовы працэс пераўтварэння металічнага каркаса ў раскошную карэту можна ўбачыць на сайце кузні vajure.by.

Утульна, прыгожа, шыкоўна і ўнутры каванага шэдэўра: мяккія сядзенні, мілыя шторкі, якія ўвечары падсвечваюцца дэкаратыўнымі ліхтарыкамі – рамантыка няйначай… І ўявіце: ля вас будуць завіхацца лёкай і кучар, для якіх прадугледжаны месцы наперадзе карэты, вашы рэчы пакладуць у адмысловы куфэрак, а пара грацыёзных скакуноў паімчыць па-каралеўску ў сапраўдную казку!



Сяргей Грыневіч адзначыў:

– Карэта – гэта наш інвестыцыйны праект. Будзем яго прэзентаваць у рамках "Вішнёвага фестывалю" падчас правядзення інвестфоруму, сярод разглядаемых пытанняў якога – развіццё коннага спорту і турызму, папулярызацыя здаровага ладу жыцця. Ужо распрацоўваем конныя маршруты з развітай інфраструктурай працягласцю ад адной гадзіны да некалькіх дзён. Латвія і Літва гатовы да супрацоўніцтва з намі. У суботу, 18 ліпеня, таксама ў рамках фестывалю пройдуць спаборніцтвы па канкуры на Кубак Глыбоцкага мясакамбіната. Чакаем аматараў коннага спорту у 12.00 у вёсцы Барок.

Між іншым, калі рыхтавала гэты матэрыял, знайшла цікавыя факты на карысць выбару вясельнага картэжу – карэты, а не белага лімузіна: здаўна лічылася, што гукі ўдараў капыт коней прынясуць удачу маладой пары, а няспешная прагулка на свежым паветры і любаванне мясцовымі краявідамі стануць правобразам спакойнага і ціхага сямейнага жыцця маладажонаў. Хочаце – верце, а хочаце – не! Але тое, што на жаніха і нявесту ў "залочанай" карэце будзе скіравана ўвага ўсіх сустрэчных і запрошаных гасцей, і гэты шыкоўны выезд стане для маладых самым яркім вясельным успамінам – гэта факт!

# «Cherry town» – музыка вішнёвай сталіцы

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ. Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

**"Вішнёвая" музыка на гарадской сцэне загучала яшчэ ўвечары 3 ліпеня на свяце "Квітней, Глыбоччына!". Дэбютнае выступленне вакальна-інструментальнага ансамбля "Cherry town" ( у перакладзе з англійскай мовы "Вішнёвы горад") адбылося падчас правядзення конкурснай праграмы "Дзве зоркі-7".**

Пяцёра імпазантных маладых музыкантаў у адмысловых цёмна-вішнёвых касцюмах упершыню выйшлі на сцэну і адразу з чатырма песеннымі кампазіцыямі. Прагучалі тры аўтарскія песні. Чацвёртую – папулярную рэтра-песню "Трава ў дома" – выканалі старшыня райвыканкама Алег Віктаравіч Морхат разам з загадчыцай Глыбоцкага гарадскога дома культуры Жаннай Нарыцынай. Для іх гэта была таксама – прэм'ера, бо ў сапраўдажэнні "жывой" музыкі гэты дуэт выступаў упершыню.

Як мы пісалі раней, ансамбль з'явіўся па ініцыятыве Алега Віктаравіча. Толькі месяц прайшоў, як музыканты пачалі свае рэпетыцыі. У складзе ВІА "Cherry town" няма прафесійных музыкантаў. Музыка – іх захапленне. Удзень кожны з іх знаходзіцца на сваім працоўным месцы. Толькі ўвечары яны збіраюцца рэпеціраваць у гарадскі дом культуры.

Клавішнік ансамбля Кірыл Петрашоў, якога яшчэ ў Глыбокім ведаюць як "ды-джея",– старшы майстар Глыбоцкага мясакамбіната. На гэтым жа прадпрыемстве працуе і Сяргей Іваноў старшым майстрам кацельні. Дарэчы, Сяргей – кіраўнік ансамбля і па сумяшчальніцтве барабаншчык.

Андрэй Шыпёнак – міліцыянер-дзяжурны ў раённым аддзеле ўнутраных спраў райвыканкама. У ВІА ён прыйшоў як бас-гітарыст.

Ігар Забаўскі – будаўнік на Глыбоцкім малочнакансервавым камбінаце. Партыі электрагітары – за ім.

Ролю саліста падчас дэбюту ансамбля выканаў Андрэй Шамета. Ён з сям'ёй пераехаў з Мінска ў Глыбокае і толькі-толькі ўладкаваўся на пасаду спецыяліста па маркетынгу жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Андрэй – аўтар першых выкананых ВІА песенных кампазіцый.

У далейшым музыканты, якія лічаць сябе толькі аматарамі, плануюць выступаць падчас разнастайных канцэртаў, падрыхтаваных у Глыбоцкім гарадскім доме культуры, каб салісты выходзілі на сцэну пад жывую музыку. У рэпертуары ВІА, у асноўным, будуць кавер-версіі песень (вядомыя кампазіцыі іншых выканаўцаў).

У суботу, між іншым, выступленне з трыма рэтра-хітамі ад "Cherry town" чакае гасцей "Вішнёвага фестывалю". Падтрымаем малады калектыў, які робіць першыя крокі на глыбоцкай сцэне і праспяваем песні мінулых гадоў разам з імі.


Кірыл Петрашоў, Сяргей Іваноў, Ігар Забаўскі, Андрэй Шамета, Андрэй Шыпёнак.

— ВЕДАЙ НАШЫХ! —

# «Вішнёвы» скульптар

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ.
Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

**На прасторах Інтэрнэту даволі часта можна сустрэць фотаздымкі саміх глыбачан, гасцей горада ля дэкаратыўна-манументальнай скульптуры "Глыбоцкая вішня". Думаю, што і ў вашых альбомах, і на вашых старонках сацыяльных сетак, паважаныя чытачы, ёсць падобны сюжэт. А жадаеце дома мець паменшаную копію гэтай адметнай скульптуры альбо завезці такі прэзент сваім родным ці знаёмым у іншы горад, краіну? Калі ласка! "Глыбоцкая вішня"-міні годна атрымліваецца ў маладога спецыяліста, майстра-ганчара Глыбоцкага дома рамёстваў Арцёма Фаміна (*на здымку*).**






Напэўна, ужо больш за дваццаць такіх "скульптур" я зрабіў, – расказваў Арцём. – Але яны доўга ў маёй майстэрні не затрымліваюцца. "Глыбоцкая вішня" заўсёды нарасхват!

У маладога ганчара заўсёды маюцца сувенірныя навінкі, сярод якіх і іншыя глыбоцкія архітэктурныя славутасці.

– Зараз гліняных вырабаў можам вырабляць у разы больш, – адзначыла выконваючая абавязкі загадчыцы раённага дома рамёстваў Святлана Скавырка. – Два месяцы таму ў нас з'явілася новая сучасная печ для абпальвання гліны, дзякуючы старшыні райвыканкама Алегу Віктаравічу Морхату. Яму вельмі спадабаліся дэкаратыўныя вазы Арцёма, а ствараць іх у старой самаробнай печцы было цяжкавата і нават небяспечна. Алег Віктаравіч прапанаваў нашаму ганчару і глыбоцкія вішанькі з гліны стварыць.

Пэўна, адметнасць мясцовых ягадак можа перадаць толькі той, хто нарадзіўся тут: Арцём Фамін – глыбачанін.

– Вучыўся ў першай гарадской школе. Наведваў у Цэнтры пазашкольнай работы гурток малявання Людмілы Мікалаеўны Лаўцэвіч. Памятаю, як у школе праходзіла мая першая персанальная выстава, за падрыхтоўку якой атрымаў грашовую прэмію аддзела адукацыі, – згадваў малады ганчар. – Вырашыў паступаць у Віцебскі тэхналагічны каледж. Закончыў дзве ступені навучання. Пасля першай набыў спецыяльнасць "выканаўца мастацкіх вырабаў у кераміцы, ювелір I ступені", пасля другой – "мастак-педагог са спецыялізацыяй кераміка".

Цікава, чаму юнак, які ніколі не ляпіў з гліны, зрабіў такі выбар? Тлумачэнне ў Арцёма простае:



– Уся група паступала на мастакоў-афарміцеляў, але мы нечакана аказаліся керамістамі. Ніколькі не засмуціўся: цікава было і ў новай справе сябе паспрабаваць, тым больш такім падкупным здавалася слова "ювелір". І сапраўды падчас вучобы рабілі ланцужкі, кольцы з металу, праўда, не з каштоўнага. І з глінай адразу "пасябраваў": падчас практыкі пасля аднаго толькі месяца вучобы вылепліваў арамалампы ў выглядзе самавараў. А маімі дыпломнымі работамі сталі тры дэкаратыўныя кашпо для кветак пад агульнай назвай "Смак". Самая вялікая – вышынёй каля 1-го метра – з вішанькамі (**на здымку**).

І юнак быццам прадказаў свой лёс: вішнёвая тэма ў яго творчасці павінна стаць галоўнай.

Пра свае першыя два гады працы ў Радашковічах на прадпрыемстве "Белхудожкерамика" Арцём успамінае без эмоцый: што тут гаварыць, калі кожны дзень трэба было рабіць аднатыпныя вазы, прычым строга выконваць план – 70 штук за змену.

– Не хачу быць машынай, – вырашыў юнак і пасля звальнення выправіўся ў Глыбокае. Не дайшоўшы нават да роднага дому, адкрыў дзверы раённага дома рамёстваў і запытаўся ў Святланы Анатольеўны Скавыркі: – Ганчар не патрэбен?

...І з гэтага ж дня ў Арцёма Фаміна з'явілася новае працоўнае месца. Па сённяшні дзень ён – метадыст па лепцы з гліны раённага дома рамёстваў, вядзе гурток для дзетак, перадае свае веды, уменні і дарослым. А такама стварае цікавыя гліняныя калекцыі свістулек, аўтамабіляў, тагачаснага беларускага посуду. Усю гэтую ляпную прыгажосць, як і самога майстра за ганчарным кругам, можна ўбачыць і на раённых святочных мерапрыемствах. Між іншым, нядаўна на свяце-конкурсе традыцыйнай свістулькі «Салавейка-2015», што праходзіў у рамках Міжнароднага фестывалю песні і музыкі Падняпроўя Расіі, Беларусі і Украіны «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне» Арцём Фамін прадставіў і свае гліняныя вырабы, у тым ліку і акарыну – італьянскі музычны інструмент. Навучыўся вырабляць і іграць на іх тут, у Глыбокім.

Спадзяёмся, што калі-небудзь і глыбоцкія вішанькі ва ўмелых руках маладога майстра пераўтворацца ў музычны інструмент і "заспяваюць салавейкам".



### К чему снится вишня?

Если вишня находится в цветущем состоянии, значит, вы будете баловнем судьбы и обретете счастье. Если вишня снится с ягодами, то вы обретете счастливый дом. Срывать вишни во сне, значит, получать удовольствие и радоваться жизни. Если во сне довелось отведать вишен, впереди вас ожидают приятные моменты. Если вишни являются кислыми, следует пересмотреть свои желания. Скорее всего, вы жаждите вещей, которые практически невозможно осуществить. Цветок вишни, как правило, предвещает приближение счастья.

— ТВОРЧАСЦЬ —

# У кожным сувеніры – цяпло рук і часцінка душы

● Дзіяна ЛОСЬ,
студэнтка ВДУ імя П. М. Машэрава.
Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

**Ці можна сёння знайсці ў Глыбокім хоць аднаго чалавека, які не рыхтаваўся б да "Вішнёвага фестывалю"? Хто з песняй, хто з вершам, хто з кошыкамі спелых і салодкіх вішань сустракае гэтае любімае свята. Шмат цікавых творчых работ прадставяць на фестывальных пляцоўках работнікі раённага дома рамёстваў і народныя майстры Глыбоччыны. Жыхарам і гасцям горада будуць прадстаўлены прыгожыя сувеніры (*на здымку*).**






**Касцюм «вішанькі», пашыты Валянцінай Логвін, дэманструе майстар дома рамёстваў Марына Дземяшкевіч.**

--Усе метадысты прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да раённага свята, кожны сёння парадуе сваімі вырабамі, -- расказвае выконваючая абавязкі загадчыцы раённага дома рамёстваў Святлана Скавырка (яна ж майстар роспісу па палатне). – Я, напрыклад, прапаную свае маляваныя дываны на вішнёвую тэматыку. Госці змогуць набыць таксама саламяныя сувеніры – выцінанкі і званочкі з вішанькай, зробленыя майстрам па саламяных вырабах Юліяй Арэхавай. Парадуюць вока кожнага сувенірныя лялькі, вышытыя сурвэткі, вязаныя падстаўкі для кубкаў у выглядзе вішні, над якімі працавала метадыст па вышыўцы і вязанні Валянціна Логвін. Майстар разьбы па дрэве Віктар Дудкевіч прапануе прыгожыя сувенірныя падкоўкі, лыжкі. Арцём Фамін, які спецыялізуецца на лепцы з гліны, у гэтым годзе прадставіць мініяцюрныя гліняныя сувеніры – паменшаныя копіі манументальна-дэкаратыўнай скульптуры "Глыбоцкая вішня". І яшчэ шмат іншых вырабаў прадставяць нашы народныя майстры на "Вішнёвым фестывалі" на адпаведную тэматыку.

Мы рады вітаць жыхароў і гасцей нашага горада і заўсёды гатовы правесці для кожнага майстар-клас.

Хочацца нагадаць, што свае "вішнёвыя" вырабы работнікі раённага дома рамёстваў прадэманстравалі на фестывалі "Славянскі базар у Віцебску", дастойна прадставілі "брэнд" Глыбоччыны.

— СМАЧНА ЕСЦІ —

# «Вішнёвы рай» ад «Кумачак»

**Калі на свеце хтосьці дзесьці**
**Умее добра працаваць, –**
**То ўмее ён і смачна з'есці**
**І адпаведна – згатаваць!**

Гэта дэвіз клуба аматараў беларускай нацыянальнай кухні "Кумачкі", што дзейнічае пры Гатаўшчынскім сельскім доме культуры.

– Наш калектыў невялічкі – гэта настаўніца пачатковых класаў Гатаўшчынскай школы Вольга Чаславаўна Андзілеўка, хатняя гаспадыні Таццяна Аляксееўна Будрэвіч і Лідзія Віктараўна Гуйда, прыбіральшчыца Гатаўшчынскага дома культуры Таіса Анатольеўна Пацеева, сацыяльны работнік Святлана Збігнеўна Развадоўская, бібліятэкар Зоя Іосіфаўна Грыдзюшка, – прадставіла сваіх актыўных удзельніц загадчыца дома культуры і кіраўнік клуба Вольга Фёдараўна Пацянкоўская. – "Спецыялізуемся" на стравах беларускай нацыянальнай кухні. Рэцэпты знаходзім падчас экспедыцый па вёсках, згадваем самі, як і што бабулі гатавалі. Вось нядаўна, у чэрвені, тагачаснае глыбоцкае меню – клёцкі, дранікі, кішкі наліваныя, каўбаскі, ватрушкі, пернікі мядовыя, раўгеню…– у нашым выкананні паспрабавалі пастаўчане і госці фестывалю "Звіняць цымбалы і гармонік".

Дарэчы, сабраныя рэцэпты гаспадынькі збіраюць і друкуюць – атрымліваюцца невялічкія брашуркі з жартоўнымі вершамі, дасціпнымі выслоўямі да кожнай стравы. Аўтар вершаваных радкоў – свой, мясцовы, Таццяна Аляксееўна Будрэвіч.




Не абышлі ўвагай "Кумачкі" і "Вішнёвы фестываль". Для гаспадынек-глыбачанак – гэта райская тэма.

Раскашуе каралевай вішня фестывальная:

*Стравы з вішняй справа,*
*злева –*
*Усім запамінальныя.*
*І куды не кінеш вока*
*Тут і там "Вішнёвы рай",*
*Што за вішні ў Глыбокім…*
*Вельмі смачна – паспытай!*

Гэта радкі з кніжачкі рэцэптаў серыі "Пячом і варым" ад клуба аматараў беларускай нацыянальнай кухні "Кумачкі", якая так і называецца "Вішнёвы рай".

Упрадмове "Кумачкі" напісалі: "У народнай традыцыі вішня сімвалізуе надзею, маладосць, жаночую прыгажосць. Здаўна вішнёвы сад быў любімым месцам адпачынку. Яны выконваюць функцыю абярэгу ад злой сілы.

З даўніх часоў існуюць павер'і. Калі падысці да вішнёвага дрэўца і дакрануцца да вішанек – шчасце прыйдзе, дакрануцца да лісцікаў дрэўца – грошы прыбудуць, а калі пацерці галінкі дрэва – будзе роўная дарога ў жыцці. А калі маладая дзяўчына марыла выйсці замуж – павінна пастаяць каля вішні, расказаць свае сакрэты і абавязкова мары збудуцца. А наогул, калі дзяўчына і хлопец, узяўшыся за рукі, тры разы пройдуць вакол вішнёвага дрэўца, абавязкова ў наступным годзе будзе вяселле…"

Глыбоцкім юнакам і дзяўчатам пашчасціла – вішнёвых дрэўцаў у нашай мясцовасці хапае. І калі ў наступным годзе колькасць рэгістрацыі шлюбаў павялічыцца ў разы, то будзем верыць, што ўсе гэтыя вяселлі – "вішнёвыя".

"Вішнёвы фестываль" – у разгары. Самы час сабраць за святочны стол родных, блізкіх, знаёмых, прыгатаваўшы смакату з вішань. Рэцэпты "Кумачак" – вам у дапамогу!

***Настойка "Вішнёвая глыбачанка"***

*Калі хоць раз сустрэнешся*
*ты з ёй,*
*То будзеш марыць толькі*
*ёй адной:*
*Яскравая, іскрыстая,*
*Хмяльная, прамяністая –*
*Любому скружыць галаву.*

У шкляны буталь насыпаць памытыя і перабраныя вішні, засыпаць іх цукрам (па сваім гусце) і паставіць на сонца. Калі цукар разыдзецца, вішні стануць нібы падвяленыя, а сок празрыстым – настойка гатова.



***"Вішня ў шакаладзе"***

*Калі вішня ў шакаладзе,*
*Значыць, гаспадар не*
*ў накладзе.*

Памыць вішні з галінкай, абсушыць. Распусціць плітку шакаладу, абмакнуць вішню спачатку ў шакалад, а потым у халодную ваду.

***Вішнёвае варэнне "Без каментарыя"***

*Многа ў Бога мы не просім:*
*Сеем, жнем і сена косім.*
*І жыццё нам наша міла,*
*Толькі б вішня ўрадзіла.*

З вішань выдаліць костачкі, абліць іх халоднай вадой з лёдам, пасля таго заліць густым цёплым сіропам, і хай пастаяць так цэлую ноч. Назаўтра варыць на малым агні з перапынкамі.

***Бліны "Вішнёвыя"***

*Пакладзіце вішні ў*
*аладкі ці бліны –*
*Будуць смачныя яны.*

Зрабіць цеста на аладкі: 2 яйкі, кіслае малако, 1 чайная лыжка соды, гашанай воцатам, соль і цукар па смаку, мука. Вішні памыць і выдаліць костачкі. Змяшаць цеста з вішнямі і выпякаць на алеі.

Заканчэнне на 8-й стар.

# Смачныя фантазіі глыбоцкіх кандытараў

● Наталля БЕЛЬСКАЯ.
Фота аўтара і Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

**Пабываць на "Вішнёвым фестывалі" і не пакаштаваць саладкага дэсерта з вішань. Хіба такое магчыма? Для ўсіх сладкаежак і аматараў выпечкі, якія завітаюць на сёлетні, трэці, дарэчы, па ліку фестываль, сюрпрыз падрыхтавалі кандытары раённых прадпрыемстваў. Як расказала галоўны тэхнолаг Глыбоцкага хлебазавода Рэната Гапон, акрамя ўжо вядомых глыбачанам піражных з вішанькамі, тварожнага торта з чарэшняй і торта "Казка" з вішнёвым джэмам, на прылаўках магазінаў хутка з'явяцца два новыя віды прадукцыі з вішняй, рэцэпты якіх распрацаваны спецыяльна да чарговага "Вішнёвага фестывалю": гэта рулет "Вішнёвы смак" і пірог "Вішнёвы край".**






А на мінулым тыдні на хлебазаводзе актыўна рыхтаваліся да "Славянскага базару". Вялікі пірог у выглядзе кошыка з вішнямі, ягадныя торцікі, каравай з лагатыпам "Вішнёвага фестывалю" – усю гэту апетытную прыгажосць маглі пакаштаваць віцябчане і шматлікія госці фестывалю на выставе-дэгустацыі. Да яе, між іншым, рыхтаваліся і ў райспажывтаварыстве.

--На пробу ў фестывальны Віцебск паехалі невялічкія кексікі, якія называюць мафіны, безумоўна, з чырвонай вішанькай наверсе, шакаладныя каптэйкі з вішняй, карзіначкі "Вішанька", пціфуры "Чэры" – гэта такія маленькія піроджныя, бісквітнае піроджнае "Асалода" і піроджнае пясочнае "Вішнёвы хіт", упрыгожнае лісцікамі вішні, -- расказала начальнік вытворчасці кандытарскага цэха райспажывтаварыства Вольга Карчэўская.





Не хвалюйцеся, паважаныя чытачы, усю гэту вішнёвую смакату паспрабуеце і вы. У апошнія дні "Вішнёвага фестывалю", у пятніцу і суботу, глыбачан і ўсіх тых, хто прыедзе да нас на вішнёвае свята, чакае выстава-дэгустацыя кулінарных вырабаў "Вишнёвое изобилие", якая пройдзе ў гандлёвым цэнтры "Родны кут". Прыходзьце – не пашкадуеце!

## Интересный факт

Вишню по-другому еще называют сердечной ягодой из-за ее благотворного влияния на сердечно-сосудистую систему организма. Р-витаминоактивные дубильные вещества в сочетании с аскорбиновой кислотой и пигментами, содержащимися в плодах вишни, способствуют укреплению кровеносных капилляров, повышению их тонуса, а также снижению высокого артериального давления. То же сочетание полезных веществ в вишне делает организм человека более устойчивым к неблагоприятным факторам воздействия окружающей среды, в том числе к повышению радиационного фона.



# «Вишнёвое» путешествие

• По материалам Интернета подготовил Андрей ПАНКРАТ.

**В 2013 году в Глубоком впервые прошёл «Вишнёвый фестиваль», а наш город был объявлен Вишнёвой столицей Беларуси. Вишню, как традиционную садовую культуру, славят не только у нас, но и во многих других странах мира, например, в Австралии, Сербии, Хорватии, Канаде, Литве, Корее, Японии, России, США. Праздники в честь вишни там давно стали традиционными и любимы не только местными жителями, но и туристами, которые спешат на фестивали, чтобы отведать вкуснейших вишнёвых блюд и напитков, принять участие в развлекательных программах или попросту насладиться красотой цветущих деревьев. Мы все хорошо знаем, как проходит «Вишнёвый фестиваль» в Глубоком, поэтому будет не безынтересным узнать обо всех особенностях вишнёвых фестивалей, проводимых за рубежом, а для этого совершим заочное путешествие.**


Вишнёвый фестиваль-2014 в Глубоком.

## Австралия

В штате Новый Южный Уэльс расположен небольшой городок Янг. Здесь проживает всего 7 тысяч человек, которые гордятся тем, что их Вишнёвый фестиваль -- один из самых известных в мире, собирающий гостей не только из Австралии, но и многих других стран.

Именно в этом городке уже более 60 лет проводится Национальный Фестиваль Вишни (National Cherry Festival). Торжества проходят с 30 ноября по 2 декабря -- в период активного сбора урожая вишни. Организаторы придумывают мероприятия, которые подчёркивают важную роль региона, как основного сельскохозяйственного центра.




В Янге выращивают множество сортов вишни: красные, белые и даже чёрные. Во время фестиваля их можно купить на распродаже в любом количестве. А еще в Янг едут, чтобы побывать на различных показах, встречах, поучаствовать в соревнованиях и конкурсах. Главными номерами фестиваля считаются парад фестиваля, шоу домашних животных, шоу раритетных автомобилей.

## Хорватия

С 6 по 14 июня в хорватском городке Ловран проводится Вишнёвый фестиваль, организуемый в честь вкуснейшего сорта местной вишни -- яркой по цвету и насыщенной по вкусу.

В эти дни город наполняется туристами. Их привлекают местные кафе и рестораны, где подают вкуснейшие блюда и напитки из вишни, а еще они с интересом смотрят выступления национальных музыкальных ансамблей. В последний день фестиваля все участники праздника собираются на дегустацию гигантского вишнёвого штруделя.

## США

В конце марта - начале апреля Вашингтон встречает фестиваль Цветущей вишни. Именно на этот период приходится пора цветения четырёх тысяч вишнёвых деревьев, красоту которых не передать словами.

В рамках фестиваля организуются такие мероприятия, как прогулки по реке Потомак, экскурсии по столичным паркам, во время которых можно узнать о редких деревьях, сортах вишни, истории города. Соревнования по запуску воздушных змеев собирают большое количество участников и зрителей. Рестораны и кафе предлагают в эти дни исключительно «вишнёвое» меню. По центральной улице Вашингтона проходит большой «вишнёвый» парад, в котором принимают участие не только жители города, но и звёзды кино, музыканты. Завершается фестиваль красочным фейерверком.

## Южная Корея

Весной зацветает сакура (вишня). Она любима не только японцами, но и корейцами. В эти дни в страну съезжается огромное количество туристов, которые желают полюбоваться красотой цветущих вишен. Главная достопримечательность - вишнёвая аллея Южнонно в столице страны Сеуле, где 1400 деревьев в апреле воссоздают зимнюю сказку.

Программа Вишнёвого фестиваля включает в себя выступления корейских артистов, цветочные и художественные выставки. Тем, кто предпочитает соревнования на силу и выносливость, предлагается участие в забеге по лестнице небоскреба: приз получает тот, кто первым достигает 63 этажа. Местные мастера тату-салонов бесплатно сделают татуировку цветущей сакуры.

Но не только в Сеуле отмечают этот праздник. На острове Чечжудо цветет королевская вишня, которая получила своё название за крупные цветы. Здесь же организуется и музыкальный фестиваль, который позволяет туристам насладиться красотой природы и живым звучанием музыкальных композиций.

В провинции Кенсан-Намдо в дни вишнёвого фестиваля предлагают пройти по вишнёвой аллее, которая получила название «свадебная дорога». Считается, что она волшебная, поэтому если пройтись по аллее взявшись за руки, тогда супруги проживут вместе долго и счастливо.



## Канада

Весной Ванкувер наполняется ароматом 36 тысяч цветущих вишен, а это значит, что наступает пора для грандиозного праздника - Вишнёвого фестиваля. Каждый его участник одевается в самые лучшие свои одежды, в которых должен обязательно присутствовать розовый цвет, символизирующий цветение вишни.

Каждый день фестиваля наполнен разнообразными культурно-массовыми мероприятиями: организуются чтения стихов, устраиваются концерты, проводятся уроки рисования, продажа сувениров. Кроме того, всегда можно пообщаться со специалистами, которые на профессиональной основе занимаются садоводством.

## Литва

Вишнёвый фестиваль Zagare Cherry Festival в этой стране организуется в небольшом старинном городке Жагаре. Главная его особенность в том, что в дни праздника город реконструируют в соответствии с архитектурными традициями 18 века. Например, воссоздают рыночную площадь, где работают ремесленники, торгуют «вишнёвым» товаром купцы. В течение четырёх дней участники фестиваля соревнуются в конных турнирах, посещают выставки декоративных поделок и музейных экспонатов. Уличные музыканты радуют гостей города и местных жителей своими выступлениями.



## Сербия

В селе Великая Плана с недавнего времени стали проводить Вишнёвый фестиваль. Главная его особенность - торговля плодами вишни и организация «круглых столов» по развитию садоводства.

То, что здесь самые дешевые вишни, знают не только в Сербии, но и многих других странах: в окрестностях Великой Планы высажено более 2 миллионов деревцев, а в самом селе заложен вишнёвый сад, площадью в 500 гектаров.

Во время фестиваля вручаются награды лучшим садоводам, а также выбирают «Мисс вишню» - мероприятия, которые вызывают наибольший интерес у гостей сербского села.

## Россия

В России на звание Вишнёвой столицы претендуют два населённых пункта: село Ширяево (Самарская область) и город Владимир.

В Ширяеве фестиваль носит название «Жигулёвская вишня», который посвящён уникальному сорту вишни - бещевской, которая произрастает у подножия Жигулёвских гор.

Во время фестиваля организуется «Праздник вишнёвого пирога», во время которого местные кондитеры предлагают приготовленные хлебобулочные и кондитерские изделия с вишнёвыми начинками. Также можно отведать другие блюда из вишни: блинчики, вареники, солянку-вишнянку и многое другое в открытом на время фестиваля «Вишнёвом кафе».

В дни празднества работает ремесленный городок, где можно поучаствовать в мастер-классах по традиционным ремёслам. Организуется ярмарка по продаже вишнёвых сувениров. Под открытым небом на импровизированных сценах выступают фольклорные и песенные коллективы.

Во Владимире в 19 веке было 418 вишнёвых садов. Сегодня их гораздо меньше, но местная городская администрация ставит цель восстановить их количество и для этого делает все возможное, чтобы сподвигнуть людей на закладку вишнёвых садов. Этому во многом способствует проводимый Вишнёвый фестиваль.

Кроме традиционных угощений в программе праздника русские забавы-игры, мастер-классы по изготовлению сувениров своими руками, гадания на вишнёвых косточках, концерты знаменитых владимирских ансамблей «Вишенка» и «Разгуляй».

# ПРОГРАММА
## районного праздника «Вишнёвый фестиваль»

**15 июля (среда)**
***Тематическая программа «Зимняя вишня»***

**17.00 – 18.00** Юбилейная концертная программа народного клуба ветеранов «Монолит».
Центральная площадь.

**18.00 – 20.00** Выступление коллективов художественной самодеятельности района.
Центральная площадь.

**20.00 – 21.00** Ретро-дискотека «Вишневые ритмы».
Центральная площадь.

**16 июля (четверг)**
***День молодежи «Цветущая вишня»***

**12.00 – 13.30** Игровая программа «Игры вишневого двора».
Центральная площадь.

**13.40 – 14.00** Фитнесс-программа «Мы выбираем здоровье!».
Центральная площадь.

**14.00 – 15.00**
Спортивная игра «Вишневый квест».
Набережная оз. Кагальное.

**15.00 – 16.00**
Мастер-класс по лепке из глины.
Глубокский дом ремесел (ул. Гагарина, 4).

**16.10 – 17.30**
Авто-шоу «Молодость. Безопасность Профессионализм».
Автомобильная стоянка за гостиницей.

**18.00 – 19.30**
Концертная программа «Вишневый Джем».
Центральная площадь.

**19.30 – 20.30**
Открытие фотовыставки «Глубоччина молодая».
Центральная площадь.

**20.30 – 21.30**
Конкурсная программа «Мистер вишневый фестиваль».
Центральная площадь.

**21.30 – 23.30**
Дискотека «ВишневыйMIX» с участием ди-джеев.
Центральная площадь.

**23.30 – 1.00**
Кино под звездами.
Автомобильная стоянка.

**17 июля (пятница)**
***Тематическая программа «Даешь вишневое настроение»***

**10.00** Выставка-продажа продукции кулинарных изделий.
Торговый центр «Родны Кут».

**10.00 – 17.00** Инвестиционный форум .
Глубокский городской дом культуры (ул. Коммунистическая, 10).

**11.00 – 13.30** Научно-практический семинар по садоводству.
Зал заседаний Глубокского районного исполнительного комитета.

**18.00 – 21.00** Выступление зарубежных коллективов.
Центральная площадь.

**21.00 – 23.00** Этнодискотека «Вишневый фестиваль собирает друзей».
Центральная площадь.

**В программе праздника:**
**9.00 – 21.00** Работа летнего кафе.
Центральная площадь.

**17.00 – 21.00**Выставка-ярмарка работ народных мастеров «Глубокский вернисаж».
Центральная площадь.

**18 июля 2015 (суббота)**
***Вишневый фест***

**9.30** Выставка-дегустация кулинарных изделий «Вишневое изобилие».
Торговый центр «Родны Кут».

**9.30** Инвестиционный форум.
Глубокский городской дом культуры (ул. Коммунистическая, 10).

**10.00 – 11.00** Пресс-конференция и подписание договоров.
Зал заседаний Глубокского районного исполнительного комитета.

**11.00 – 11.30** Торжественное шествие «В королевстве вишен» от монументально-декоративной скульптуры «Глыбоцкая вішня».
До Центральной площади.

**11.30 – 13.00** Праздничная программа «Вишневая столица».
Центральная площадь.

**13.00** Смотр-конкурс подворий «Парад вишневых пирогов и ароматных наливок».
ул. Ленина.

**14.00 – 15.00** Торжественная регистрация брака «Вишневая свадьба».
Сквер молодоженов.

**15.00 – 16.20** Конкурс вокалистов «Венок мелодий дружбы».
Центральная площадь.

**16.30 – 17.50** Конкурс баянистов «А гармонік грае, грае».
Центральная площадь.

**18.00 – 19.00** Театрализованная программа «Щедрая вишня».
Центральная площадь.

**21.00 – 21.45** Фолк-электроника группа «PAWA».
Центральная площадь.

**22.00 – 23.00** Группа «Ok.Bend».
Центральная площадь.

**23.00** Праздничный фейерверк.
Центральная площадь.

**В программе праздника:**

**10.00 – 19.00** Работа подворий «Парад вишневых пирогов и ароматных наливок».
Ул. Ленина (от 1 до 2 светофора).

Вернисаж и презентация видеофильмов «Вишневая мозаика».
Глубокский центр традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40).

Туристическая выставка «Вишневый городок».
Набережная оз. Кагальное.

Конкурс детских рисунков «Вишневые краски лета».
Возле Глубокского центра традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40).

Гашение почтовой марки в честь «Вишневого фестиваля» в г. Глубокое специальным почтовым штемпелем.
Глубокский районный исполнительный комитет, около Глубокского центра традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40).

Работа торговых рядов.
По ул. Энгельса.

Выставка-ярмарка работ народных мастеров «Глубокский вернисаж».
Центральная площадь, ул. Гагарина.

# «Вішнёвы рай» ад «Кумачак»

Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.

***Вішня заліўная***
*Заліўное мяса, заліўны язык,*
*Заліўную рыбу есці ты прывык.*
*А пакаштуй якія*
*Вішні заліўныя!*



Жэлацін замачыць у халоднай вадзе на 40 хвілін. Гэтым часам вымыць вішні і выдаліць з іх костачкі, зліць сок. У ваду ўліць вішнёвы сок і цукар, паставіць на агонь. Як закіпіць, выключыць агонь і ўліць жэлацін. Добра перамяшаць, каб жэлацін растварыўся. Даць крыху астыць. Вішні раскласці ў формы і заліць. Паставіць у халоднае месца.



*Булачкі і пірог пышны*
*Не абышліся без вішні.*

***Вішнёвы пірог***
Грамаў 150 халоднага сметанковага масла і 150 грамаў мукі расцерці ў крошку. Дабавіць грамаў 50 цукру, крыху солі, ванілі або ванільнага цукру, грамаў 150 тварагу і замясіць цеста, каб не ліпла да рук. Укруціць цеста ў плёнку і пакласці ў халадзільнік на гадзіну. Падрыхтаваць начынку. Вымыць вішні і выдаліць з іх костачкі, пакласці ў каструлю, дабавіць цукар і паставіць на невялікі агонь (колькасць цукру залежыць ад кіслаты вішні). Жэлацін замачыць на 10 хвілін. Калі вішні закіпелі, выключыць агонь і ўліць жэлацін. Добра перамяшаць, каб жэлацін растварыўся, і даць астыць начынцы.

Цеста раскатаць у пласт таўшчынёй 1 см і пакласці ў форму для выпечкі, накалоць відэльцам. Выпякаць 15-20 хвілін. Даць аснове астыць, а потым на яе выкласці спачатку вішні, паставіць на 10 хвілін у халадзільнік, а пасля заліць халодным сокам. Паставіць у халадзільнік да поўнага застывання.

***Міні-піражок***
Змяшаць відэльцам яйка з трыма сталовымі лыжкамі цукру, затым дабавіць 2 сталовыя лыжкі парашка какавы. У другой місцы перамяшаць 3 сталовыя лыжкі мукі, 1 сталовую лыжку крухмалу і 1 чайную лыжку соды, гашанай воцатам. Затым дабавіць 3 сталовыя лыжкі алею, 5 сталовых лыжак малака і ўсё перамяшаць. Атрымліваецца негустое цеста, якое выліць у маленькую форму, змазаную маслам. Выпякаць 20 хвілін. Зрабіць крэм: няпоўны стакан смятаны, узбіць з 4 сталовымі лыжкамі цукру. Гатовы пірог разразаем упоперак на 3 часткі. Кожную частку прамазываем крэмам і пасыпаем вішнямі без костачак. Складаем часткі ў міні-піражок.



***Пірог "Зімняя вішня"***
Паўкілаграма, пажадана сухога тварагу, змешваем са шклянкай манных круп. 5 яек і шклянку цукру ўзбіваем да пышнай пены.

Затым у тварог, змешаны з "манкай", вельмі акуратна, пакрыху дабаўляем ўзбітыя яйкі. Вельмі асцярожна перамешваем. Атрымліваецца густаватае цеста. Сюды ж дабаўляем палову чайнай лыжкі соды, гашанай воцатам, крыху ванільнага цукру.

Форму змазваем маслам, пасыпаем маннымі крупамі і выліваем у яе цеста. Зверху пасыпаем парэзанымі вішнямі: цэлыя вішні пад сваім цяжарам крыху абсядзяць цеста, а кавалачкі раўнамерна размяркуюцца па ім. Выпякаць 40-50 хвілін. Даць астыць і толькі потым наразаць.

Галоўнае, усё змяшаць ва ўказанай паслядоўнасці і тады гэты пірог спадабаецца нават тым, хто не сябруе з тварагом.

***Пачастунак «Вішанька»***
125 грамаў шакаладу, пажадана цёмнага, паламаць, дабавіць 50 грамаў вяршкоў, сталовую лыжку цукру, падагрэць, добра перамяшаць. дабавіць 1 сталовую лыжку растваримай кавы, добра перамяшаць, даць астыць.

200 грамаў вяршкоў узбіць з 1 сталовай лыжкай цукровай пудры, як вяршкі пачнуць гусцець, дабавіць астыўшую шакаладную масу.

250 грамаў пячэння перамалоць у дробную крошку, змяшаць з прыгатаванай масай. Зрабіць невялікія ляпёшкі, пасярэдзіне пакласці марожанае і вішню. Прыпадняць краі ляпёшкі і паставіць у маразільнік.

**Да сустрэчы, на "Вішнёвым фестывалі"!**


**«Веснік Глыбоччыны»**
**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
**Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў.**
**Выходзіць у сераду і суботу.**
Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйны № 73 ад 3 сакавіка 2009 г. Індэкс 63968.
Аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.



**Адрас:** 211800, г. Глыбокае, вул. Чырвонаармейская, 2.
E-mail: glubokoe@vitebsk.by
ТЭЛЕФОНЫ
рэдактара -- 2-13-39,
намесніка рэдактара -- 2-24-85,
адказнага сакратара і аграпрамаддзела -- 2-11-46,
аддзела сацыяльных праблем і сувязей з грамадскасцю -- 2-11-45,
бухгалтэрыі -- 2-11-48 (факс),
аддзела рэкламы -- 2-13-39 (факс).



Р/р 3012024925589 у ЦБП № 208 ф-ла № 216 ААТ «ААБ Беларусбанк» у г. Полацку. МФА 648, УНП 300022458, АКПА 02478065

ISSN 2075-7948

Галоўны рэдактар Андрэй Міхайлавіч ПАНКРАТ

Дызайн і вёрстка Сяргея Краўчонка.
Карэктар Іван Букоўскі.

Газета набрана на настольна-выдавецкай сістэме ў рэдакцыі, перададзена па каналах сувязі і надрукавана ў КПУП «Наваполацкая друкарня»: вул. Блахіна, 26. Друк афсетны.

Падпісана ў друк 14.07.2015 г. у 17.00. Заказ № 3554. Тыраж 6912.